Жывая класіка

Бібліятэка часопіса «Вясёлка»

Эдзі Агняцвет

# У СВЕЦЕ ДАБРЫНІ



Серыя «Бібліятэка часопіса “Вясёлка”»

Эдзі Агняцвет

# У СВЕЦЕ ДАБРЫНІ



Зборнік вершаў

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2013

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-5
А24

*Серыя заснавана ў 2013 годзе*

Заснавальнікі серыі: *Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі, Мікалай Аляксандравіч Супрановіч*
Галоўны рэдактар серыі: *Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі*
Рэдкалегія серыі: *Раіса Баравікова, Анастасія Радзікевіч, Святлана Богуш, Алена Бычко, Аксана Самацветава, Ванда Жалудкова*
Укладальнікі: *Алена Бычко, Святлана Богуш*

У кнізе выкарыстаны малюнкі: *А. Волкава, Ул. Лося, А. Луцэвіча, А. Грубінай, Ул. Рамейкі, А. Плаксіна, В. Ціхановіча, Ю. Пучынскага, Я. Змітровіча, Б. Заборава, І. Давідовіча, В. Шаранговіча, Э. Гусейнава, Н. Грамыкі, У. Пашчасцева, М. Захаркевіча, Н. Паплаўскай, С. Волкава, Т. Беразенскай, А. Лось, В. Тарасава, Я. Ларчанкі, П. Драчова, Н. Суставай, І. Лобан, І. Ліпскага, І. Лобан, А. Салькова, В. Шрамякова*

**Агняцвет, Э.**
А24 У свеце дабрыні : зб. вершаў / Эдзі Агняцвет ; уклад. : Алена Бычко, Святлана Богуш. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2013. — 120 с. : іл. — (Серыя «Бібліятэка часопіса "Вясёлка"»).
ISBN 978-985-471-656-5.

На кнізе вершаў выдатнай паэткі Эдзі Агняцвет смела можна зрабіць надпіс: «Праверана часам». Вершы былі напісаны для часопіса «Вясёлка» дзясяткі гадоў таму, але і сёння яны сучасныя, вельмі жыццярадасныя, добрыя і ззяюць усімі колерамі вясёлкі.

Маленькія чытачы кнігі атрымаюць вялікае задавальненне ад цудоўных твораў, засвояць многія важныя ісціны і правілы паводзін, навучацца прыгожаму беларускаму маўленню.

Кніга будзе карысная выхавальнікам устаноў дашкольнай адукацыі, бабулям і дзядулям, мамам і татам і, вядома, дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-471-656-5**

© Бычко А., Богуш С., укладанне, 2013
© Афармленне. РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2013



Эдзі Сямёнаўна Агняцвет
1913—2000

# СЯБАР ДЗЯЦЕЙ

Эдзі Сямёнаўна Агняцвет назаўжды ў маім сэрцы, у маёй памяці. А памяць – гэта тое золата, якое знітоўвае людзей, іх лёсы, злучае паміж сабой цэлыя пакаленні і стагоддзі.

Веру, знакамітая паэтэса ў памяці і тых дзяцей, якія некалі чыталі і вучылі на памяць яе вершы і цяпер сталі дарослымі, бацькамі сваіх сем'яў.





А наша кніга задумана ўзбудзіць добрую памяць пра Эдзі Агняцвет у сучасных юных чытачоў.

Што мы прапануем?

Давайце, сябры, перачытаем усе вершы, якія друкавала Эдзі Сямёнаўна ў «Вясёлцы».

Гэта якраз столькі гадоў, а можа, і болей, як сёння вашым мамам і татам. Мы хочам і іх вярнуць у



дзяцінства. Пра гэта нагадаюць ім не толькі вершы Эдзі Агняцвет, а і малюнкі вядомых мастакоў, якія афармлялі яе вершы.

А калі вам захочацца глыбей пазнаць творчасць слыннай паэтэсы, то пашукайце ў бібліятэках яе кнігі «Міхасёк», «Доктар Смех», «Ад зярнятка да вясёлкі», «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя», «Хай часцей смяюцца дзеці». Ведайце, за кніжку «На двары алімпіяда» Міжнароднае журы па дзіцячай літаратуры прысудзіла Эдзі Сямёнаўне ганаровы Дыплом Ханса Крысціяна Андэрсена. Імя паэтэсы занесена ў Ганаровую кнігу вялікага дацкага казачніка.

Эдзі Сямёнаўна вельмі любіла музыку. Шмат хто з кампазітараў сачыняў песні на яе словы.

Яна напісала лібрэта музычнай казкі «Джанат» і оперы «Марынка».

У «Вясёлцы» захавалася пажаданне Эдзі Сямёнаўны дзецям. Перадаем яго вам тым почыркам, якім пісала паэтэса:

Чытачам „Вясёлкі"

Яна не толькі добры госць,
Яна – Ваш друг найпершы.
„Вясёлка" ёсць і казкі ёсць,
Загадкі, песні, вершы.

Калі Вы будзеце расці
Руплівыя, як пчолкі, –
Свяціць Вам будуць у жыцці
Усе колеры Вясёлкі!

Эдзі Агняцвет

Паэтэса хацела, каб усе дзеці раслі здаровымі, шчаслівымі, працавітымі, дружнымі. Каб заўсёды з вамі былі шчырасць, дабрыня, праўдзівасць, адвага, дапытлівысць.

Эдзі Сямёнаўна Агняцвет любіла сустракацца з беларускімі дзяцьмі. Яна пабывала ў розных



краінах і заўсёды прывозіла адтуль свае новыя вершы. Жадала, каб усе дзеці Зямлі сябравалі і часцей смяяліся. А да іх бацькоў, да ўсіх дарослых у яе была свая просьба: рабіце ўсё неабходнае, каб дзецям заўсёды было цёпла ў свеце дабрыні.

Давайце пра гэта згадаем у стагадовы юбілей незабыўнай Эдзі Сямёнаўны Агняцвет. І будзем помніць яе вечна.

*Уладзімір Ліпскі,*
галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка»,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

## А ВЫ ПАЗНАЛІ?

Хто ходзіць смуглявы па вуліцы мінскай?
Ён — з Афрыкі, з дальніх краёў?
Ды гэта ж Мікітка!
Прыгледзьцеся зблізку,
Забылі вы добрых сяброў?

— Я ніколі каля Ніла не бываў,
Я ля Нёмана ўсё лета загараў.

І ўсе са здзіўленнем глядзяць
пешаходы —
Ён гэтак за лета падрос,
Наеўся суніц і пчалінага мёду,
Гуляў каля соснаў, бяроз.

А Мікітка штосьці круціць галавой:
— Не пазнаў, браточкі, вуліцы сваёй...

Дзве хаткі старыя стаялі за рогам.
Дзе хаткі? Ды іх не відаць.
Ні комінаў дымных няма, ні парога.
Там ціхія клёны стаяць.

І на лавачцы зялёнай каля дрэў
Тры хвіліначкі Мікітка пасядзеў.

З марожаным будку шукаў ён старанна, —
Не бачна слядоў, ані-ні!
А там, з-за паркана, пад'ёмныя краны
Ківалі яму з вышыні.

— Я гуляў сабе ля Нёмана-ракі,
Не гулялі тут, відаць, будаўнікі!

*1957 г.*



# ШЧОДРЫ ЦІШКА



На гармоніку губным
Цішка наш іграе:
— Ці-лі, ці-лі, ці-лі-тым, —
Доўга не сціхае.

Просіць Ганка брата Цішку:
— Можа, я пайграю крышку?
— Ці-лі, ці-лі, ці-лі-тай,
Ты гадзінку пачакай!

На канапачцы ляжыць
Новенькая кніжка.
— Не чапай яе! —
дрыжыць
Шчодры хлопчык Цішка.

І ў адказ гаворыць Ганка:
— Дай мне дзірку з абаранка,
З камізэлькі — рукавы,
Волас — з брытай галавы!



— Я не дам! — злуецца Цішка, —
Адчапіся ты, малышка!
— Цішка, мілы, вось цукеркі!
У сярэбраных паперках...

— Мне аддай, сама не еш,
Ганка, зубкі сапсуеш!

*1957 г.*

# КОТ І СОНЦА



Сядзеў на падаконніку
Агніста-рыжы кот,
Спяваў паціху песенькі
Без аніякіх нот.

Ён драпаў шыбу лапкамі
І з зайздрасцю глядзеў —
Напэўна, сонца яркае
Пакратаць захацеў.

І раптам
            скоса, здзіўлена
Зірнуў у правы кут.
Падумаў кот:
                  «З'явілася
Другое сонца тут!»

І проста з падаконніка
Ён кінуўся наўскач:
Каціўся, быццам сонейка,
Мой новы жоўты мяч.

І стала кату́ весела,
З мячом гуляе ён.
Куляецца, змагаецца —
Не кот, а чэмпіён!



А сонца працавітае
Ўзыходзіць над зямлёй —
Плыве, гаворыць з хмаркамі,
З вятрамі
            і са мной!

*1961 г.*

## МОЙ КАЛЯНДАР

Як прачнуся рана-рана,
Ўбачу ўсю зямлю я!
Гэты досвітак старанна
Ў сшытку намалюю.

Кожны, кожны ранак новы
Мае ўласны колер.
Хочаш? Зробім каляровы
Каляндар у школе!

Быццам парастак зялёны,
Першы дзень падняўся,
Заклапочаны, бяссонны,
За работу ўзяўся.
Добра, што ёсць ПАНЯДЗЕЛАК!

А наступны не чакае,
Крочыць крокам шпаркім,
Ён у сонца пазычае
Жоўты колер яркі.
Добра, што ёсць АЎТОРАК!

Гляньце, гляньце, ў нашай хаце
Сёння колер новы,
Ў фіялетавым халаце
Дзень прыйшоў чарговы.
Добра, што ёсць СЕРАДА!

Па сцяжынцы прамяністай,
Быццам майстар спорту,





У блакітнай майцы чыстай
Дзень бяжыць чацвёрты.
Добра, што ёсць ЧАЦВЕР!

Не паспее ён схавацца,
Прыйдзе гаспадыня,
Стане ў працы завіхацца
У хусцінцы сіняй.
Добра, што ёсць ПЯТНІЦА!

Дзень аранжавы, як свята,
Мне сустрэць ахвота:
Рана тата мой дахаты
Вернецца з работы.
Добра, што ёсць СУБОТА!

О, які дзянёк бясхмарны!
І зара над клёнам,
І лісточак каляндарны
З водбліскам чырвоным.
Добра, што ёсць НЯДЗЕЛЯ!

Прачынаюся на золку,
Свет я разглядаю,
Фарбы тыдня я ў вясёлку
Яркую збіраю.
А, па-твойму, як?
Выглядае ўсё іначай?
Так малюй, як сам убачыў!

*1962 г.*

## ЦІХІ ВЕЧАР

Ходзіць сон у цёплых ботах —
Светла-сіні, залаты.
Апускаецца дрымота,
Засынай хутчэй і ты!
Спі, Галінка!

А дачка адкрыла вочы,
Засынаць яна не хоча:
— Я ня маю часу спаць,
Трэба ляльку калыхаць.



Той, хто спіць,
расце здаровы,
Лялька, ляж на правы бок!
Я ж табе пашыю новы
Паркалёвы фартушок.
Стужкі з крамы прынясу я,
Акуратна адпрасую.
Люлі, лялька!

Ды не хоча лялька спаць,
Стала зайку калыхаць:
— Ходзіць сон у цёплых ботах.
Спі, мой зайка, люлі-лю!
Рукавічкі для работы
Я табе, малы, зраблю.
І не змогуць застудзіцца
Лапкі ў белых рукавіцах.
Спі, мой зайка!

...Кожны мае тут нагрузку:
Мама шые Галі блузку,
Галя — ляльцы фартушок,
Лялька вяжа рукавіцы.
І нікому тут не спіцца,
Хай сабе гусцее змрок!



Сон ступае сам не свой.
Ёнківае галавой:
— Неспакойныя часіны!
Клапатлівыя жанчыны!

*1962 г.*



# МУЗЫКАНТЫ

Міхасёк гасцей збірае.
Ўся кампанія ідзе:
Кот на скрыпачцы іграе,
А сабака — на дудзе.

Запявае вожык басам,
Б'е камар у барабан.
Певень выскачыў тым часам,
Ухапіўся за баян.

З гусаком карова ў пары
Выступаюць спакваля.
Міхасёк паплыў на хмары,
Закружылася зямля.

*1963 г.*



## ЯК НАС ЗДЫМАЎ ФАТОГРАФ

Прыходзіць ён у сад дзіцячы,
А мы шумім,
смяёмся,
скачам.
Ён галавою паківаў:
— Смяяцца нельга! —
загадаў.

Чаму?
Якая тут загадка?
Фатограф пляснуў звонка ў ладкі,
Вачыма важна ўсіх абвёў:
— Ды вы ж не маеце зубоў.
Сядайце!..

Мы сціскаем губы,
Якраз мяняюцца ў нас зубы...
З бліскучай скрынкай ля дзвярэй
Стаіць фатограф-чарадзей.

Мы цэлых пяць хвілін трывалі
І толькі шчокі надзімалі.
Здымаўся разам з намі кот,
Які смяяўся на ўвесь рот.

*1963 г.*

# Я — РАБОЧЫ

Адкрывае хлопчык вочы,
Кажа хлопчык:
— Я — рабочы!
Ён памыўся і паснедаў,
Малаток узяў у дзеда.

— Стукай-грукай, малаток! —
Напявае Петрусёк.
У сцяну забіў цвічок
І павесіў ручнічок.

Працаваў, не смуткаваў,
Зоры ясныя каваў.
І са стукам-перазвонам
Месяц выкаваў зялёны.

Потым хлопчык Петрусёк
Птушцы выкаваў лісток,
Для пчалы — званочак-краску,
А для нас з табою — казку.

*1963 г.*



# МАМА ПЕСЦІЛА МАЛОГА

Мама песціла малога:
— Ты мой зайчык-пабягайчык,
Быстраногі мой зайчына!
Адказаў хлапчына строга:
— Я вялікі пабягаец,
Я — не заяц,
Я — мужчына.

*1963 г.*





## ГАЛОЎНЫ ДВОРНІК

Завіруха,
                завіруха!
Замяло дарогі пухам.
Цэлых дзве гадзіны
Чысцяць снег машыны.

Я рыдлёўку ўзяў таксама
І працую разам з мамай.

Толькі нас не хоча слухаць
Злая цётка-завіруха:
Носіцца, і скача,
І сіпіць,
        і плача,
І калючкі снегу
Кідае з разбегу.

І растуць сівыя горы,
Не спраўляюцца шаферы.
Цэлых тры гадзіны
Чысцяць снег машыны.

Вось на вуліцу раптоўна
Выйшаў дворнік наш галоўны.
Расчасаў ён на хаду
Агнявую бараду,

Апрануў фартух свой новы,
Сшыты з воблакаў вясновых,
І пайшоў — снягам на страх —
Па дарогах,
        па дварах.

Завіруха — цётка злая —
Па задворках уцякае.
Я крычу:
        — Працуй бясконца,
Наш галоўны дворнік — сонца!

*1964 г.*

# ЛІСТ

Папера белая ляжыць
На століку маім.
Яна паціхеньку дрыжыць
Пад ветрам веснавым.

Я з ёй пагутарыць гатоў!
Аловак сіні ўзяў.
Яшчэ нікому я лістоў
Дагэтуль не пісаў.

Каму пісаць?
«Дзі-вак,
цік-так!» —
Гадзіннік лік вядзе.
І я пачаў, нарэшце, так:
«Сініца, добры дзень!

Як ты ў гняздзе сваім жывеш?
Як вучыш ты дзяцей?
Чаму мне песень не пяеш?
Ты прылятай часцей!»

На падаконнік я цішком
Паклаў свой першы ліст.
Назаўтра
над маім акном
Пачуўся тонкі свіст.
Сініца!
Вось як піша ён —
Аловак сіні мой!
А ліст
вятрыска-паштальён
Аддаў, напэўна, ёй.

І крошкі на маім акне
Цяпер яна дзяўбе.
Штось зразумелае і мне
Пяе сама сабе.

*1964 г.*



# ЯК НАШКОДЗІЛА МАЛЬВІНА ЦАЦКАМ, ДЗЕЦЯМ І МАШЫНАМ

Даволі сварыцца
З-за кожнай драбніцы,
Прыдумаем гульні з прыгодамі!
Ты будзеш шафёрам,
А я — святлафорам,
Астатнія ўсе — пешаходамі.
Запрасі,
Калі ласка, таксі!
Ля ганка — стаянка,
На лавачцы зранку
Сядзяць пасажыры цярплівыя:
Мядзведзі, зайчыхі,
Ласіхі-французіхі
І белыя мышкі пужлівыя.
Не змясціцца
Сямейцы такой
На машыне адной
Легкавой!
Загрукалі дзверы,
І з кожнай кватэры
Выходзяць шафёры з машынамі.
Зайчыхі, паедзем!
А вы ўжо, мядзведзі,
Уважнымі будзьце мужчынамі!
Захапіце з сабой качаня,
Заадно прычапіце каня!
Па жоўтай дарожцы
Бягуць «Запарожцы»





І «Волгі» зялёныя, сінія.
І раз назаўсёды
Для ўсіх пешаходаў
Праведзена белая лінія.
Запомніце:
Гэта — не двор.
Гэта — вуліца.
Я — святлафор.

Чырвоны ліхтарык
Гарыць!
З тратуара
Сыходзіць нікому няможна —
АСЦЯРОЖНА!
Заззяе законны
Агеньчык зялёны —
Не бойся,
Ідзі, падарожны!
ПЕРАХОД!
Можаш смела ісці,
Пе-ша-ход!
Калі на дазоры
Няма святлафора, —
Там правілам добрым кіруюцца:
Налева зірніце, направа зірніце,
Агледзьце ўважліва вуліцу.
Калі не відаць машын,
Пераходзьце, дачушка і сын.
Гэй, хто з самакатам
У плацці стракатым
Бяжыць з падваротні на вуліцу?
Ды гэта ж Мальвіна,

Дзяўчына-маліна!
Вы бачылі ляльку-разумніцу?
Затрымайце яе самакат!
Лялька, лялька, вяртайся
назад!
І спыняюцца сорак машын
На пятнаццаць,
На дваццаць хвілін.
З-за гэтай задзіры
Усе пасажыры
У садзік,
У школу спазніліся.
Яе з самакатам
Прывезлі дахаты
І доўга на ляльку сварыліся.
Плача лялька,
Сядзіць ля акна,
«БОЛЬШ НЕ БУДУ!» —
Малюе яна.

*1965 г.*





## ДАЖДЖЫ



Я лаўлю рукою звонкі
Першы дождж...
З ім лячу наперагонкі
Басанож.
Сіні дожджык — працаўнік,
Ён прастойваць не прывык.
І зялёны летні лівень
Я люблю!
Кроплі падаюць імкліва
На зямлю.
Дон-дон-дон! —
І шчодры дождж
Пераблытаў з Донам Сож!
Мае колер шараваты
Трэці дождж.
Ён, як восень, сумнаваты.
Ну і што ж!
Кроплі дробныя праз сон,
Як зярняты, сее ён.
Каб ракой зрабіцца быстрай
Я магла,
Пэўна, ўсе б дажджынкі-іскры
Зберагла
Для хмурынак і вятроў —
Добрых будучых дажджоў!

*1966 г.*

## ДЗЕЦЯМ

Я вельмі шкадую аб тым, што не мела
Ў дзяцінстве «Вясёлкі»,
«Мурзілкі»,
«Барвінка»!

Цяпер я зайздрошчу вясёлым
і смелым —
Усім дарагім хлапчукам і дзяўчынкам.

У добрым здароўі гадуйцеся, дзеці,
У сэрца ўбірайце ўсе фарбы вясёлкі!
Хачу, каб вы ўсё разумелі на свеце,
А ў працы былі як руплівыя пчолкі.

*1966 г.*



## СКРЫПАЧ

Я пакуль іграю гамы толькі.
І злуюцца за сцяной суседзі:
— Што ж ты? Ані вальса, ані полькі?
Мучыш скрыпку... Мы трываем ледзьве!
Я прашу ў суседзяў прабачэння.
Я прашу вялікага цярпення.

Можа, трошкі я і надакучыў...
Пачакайце, дайце навучыцца!
Ёсць у струнах чатырох пявучых
І вятры, і ліўні, і крыніцы.

Колькі там схавана гукаў розных!
Струны — як таемныя сцяжынкі:
Хочаш —
завядуць у лес марозны,
Тонкім звонам там звіняць галінкі.
Хочаш —
Нарач-возера пачуеш,
Там вандруюць залатыя рыбкі.

Будзе час!
І ўсё, што захачу я,
Выйдзе ўсё з маленькай гэтай скрыпкі.

Чуеш? «Рэ» ідзе, як рэха, ў горы,
Музыкай напоўнена ўсё чыста.
Мінск! — І пачынаецца мой горад
З ноты «мі», яскравай, серабрыстай.

Я пакуль іграю толькі гамы,
Церпяць іх настаўнік мой і мама...
Пацярпіце вы! Я музыкантам буду,
Бо ў сваіх руках трымаю цуда!

*1967 г.*



# НАВАСЁЛЫ

Грузяць на машыну рэчы:
Кнігі, шафы,
стол і ложкі.
І калі б па-чалавечы
Рэчы размаўлялі трошкі,
Вось бы зашумелі весела
Кніга з кнігай,
крэслы з крэсламі!

Рэчы радуюцца моўчкі.
А ля ганка скача Сеня,
Ён ад сонца жмурыць вочкі,
Склаў ён песню наваселля:
— Навасёлак, наваселіца,
Сёння Сеня пераселіцца!

Там паркет з янтарным бляскам,
Сцены — колеру зарніцы.
На балконе — месца краскам,
Сінім казкам і сініцам.

Балалайка не ўтрымалася,
З чамадана абазвалася:
— Дзінь-дзінь,
Сень-цень,
Ну і добры
Будзе дзень!



*1968 г.*

# Спіць Алёнка



Які Лявонка гаманкі —
Нібы ручай вясновы!
Гудуць у доме ўсе куткі,
А ў сшытку скачуць словы.

Яго бярозавы кіёк
Для ўсіх прыгод прыгодны:
І самазвал, і скакунок,
І нават сцяг паходны.

На поўны ход ідзе гульня.
І шумна тут, і звонка.
Прыходзіць раптам цішыня:
— Маўчыце, спіць Алёнка!

Растуць малыя дзеці ў сне.
Ці сніцца сон Алёнцы?
Гайдаецца, як на чаўне,
Трохмесячнае сонца.

Пайшоў на пальчыках Лявон —
І змоўклі ручаіны.
І ўжо Лявон — не ветрагон.
Старэйшы брат. Мужчына.

*1968 г.*

## ПЕРАД ДАРОГАЙ

На сваім маленькім ганку
Бацька-шпак адзін стаіць.
І прадзе паціху восень
Залатую ніць.

Азірнуўся шпак, паправіў
Чорны ў кропельках пінжак
І над хатай звонка-звонка
Засвістаў, нібы юнак.

І вясёлая шпачыха
Адгукнулася здалёк.
Прыляцелі дзве дачушкі
І малы сынок.

Перасвістваліся доўга.
Развітацца цяжка ім
З ціхім небам, светлым гаем,
З домікам сваім.

Як збіраліся ў дарогу,
Напіліся смачных рос.
Кожны ягаду каліны
Ў дзюбачцы панёс.

Будзе з імі ў падарожжы
Водар роднай стараны.
Да сустрэчы, да спаткання,
Да вясны!

*1968 г.*





## ЛІСТОК

Звонкі лісток адарваўся ад клёна
І пакаціўся, пабег па зямлі.
А на палянцы жоўта-зялёнай,
Быццам на струнах, іграюць чмялі.

Верас ліловы, як на цымбалах,
Ціха трымціць увесь дзень дацямна.
Колеры лета рабіна сабрала,
І чырванее на сонцы яна!

Як я люблю вераснёвыя дзівы!
Ходзяць па лесе вятры-трубачы.
Толькі грыбы засядаюць маўкліва —
Песням патрэбны свае слухачы.

*1968 г.*

## НА ВАРЦЕ ГАНАРОВАЙ

Васілёк, на дзіва, ціхі, строгі,
На пачэснай варце ўпершыню.
На прасторнай плошчы Перамогі
Ён стаіць ля Вечнага агню.

Перад гэтым спаў ён неспакойна,
Уставаў, гадзіннік правяраў.
У кароткіх снах ён бачыў войны,
На якіх ніколі не бываў...

І цяпер, святочным майскім раннем,
Марш паходны чуецца здалёк,
Слухае з затоеным дыханнем
Дзевяцігадовы Васілёк.

Вось ідуць салдаты-ветэраны —
Тыя, што вярнуліся з вайны.
Першыя чырвоныя цюльпаны
На сівы граніт кладуць яны.

Пакланіўся нізка абеліску
Чалавек, што вызваляў зямлю:
Ён, знаёмы хлопчыку з калыскі,
Памахаў рукою Васілю.





Сёння тата ў форме капітанскай,
Выцвілай на сцежках франтавых,
Пазірае з гордасцю і ласкай
На шчаслівых юных вартавых.

Помніць тата цяжкія дарогі
І сваіх загінуўшых сяброў.
На вялікім свяце Перамогі
Думае аб шчасці для сыноў.

Плешча мора сцягаў пурпуровых,
Ландышаў лясных звініць паток,
І стаіць на варце ганаровай
Сын салдата — хлопчык Васілёк.

*1970 г.*

# КРАЙ СЯБРОЎ МАІХ

Я сябрую з краем бурштыновым,
Ёсць тут і бяроза, і сасна.
Я знаходжу блізкія мне словы:
Даўгава — па-нашаму Дзвіна.

Вэверэ — па-нашаму вавёрка,
Ветра — быццам чуюцца вятры.
Палыном улетку пахне горка,
Росны луг свіціцца на зары.

Я іду. І многае знаёма:
Ясені, асіны, пошум траў.
На паляне, ўжо зусім як дома,
Хтосьці нашу «Бульбу» заспяваў.

Па сцяжынках, у лясным зацішку,
«Бульба» скача ўсё далей, далей.
Слухаю маленькую латышку —
І сама спяваю весялей.

*1972 г.*







## УЗБЕКСКІ ГОСЦЬ

Наш госць з Сярэдняй Азіі
Смяяўся ад душы,
Калі яму адразу я
Сказаў: «Салям! Яхшы».

Два словы адмысловыя
Мне тата перадаў,
Калі ён хаты новыя
Ў Ташкенце будаваў.

Зямля разбушавалася,
Грымела дзень пры дні.
І ўсё, што будавалася,
Чакала цішыні.

Не знаді людзі роспачы!
...З тае цяжкой пары
У мінскага рабочага
Ў Ташкенце ёсць сябры.

А нетры ўтаймаваліся,
Забылі гнеў і злосць!
І вось мы дачакаліся —
Да нас прыехаў госць.

У дзядзькі вочы чорныя
І доўгі чорны вус,
І цюбецейка ўзорная.
Яго завуць Юнус.

Павеяла бавоўнаю,
Таполямі, вясной,
Павеяла, галоўнае,
Узбекскай дабрынёй.

Усіх з двара паклікаў ён —
Дзяўчатак, хлапчукоў.
Сабраў сям'ю вялікую
На цёплы смачны плоў.

Мы елі плоў з прысмакамі,
Хвалілі ад душы.
І кожны дзядзьку дзякаваў
Па шчырасці — «Яхшы»!

*1972 г.*



## ХТО ПЕРАГОНІЦЬ?

Залацістаю дарогай —
Хто з нас першы —
я ці дождж?
Лівень — хлопец шпарканогі,
Не адстану я!
І ўсё ж —
Каня-птушачка сціхае
І не просіць: «Піць-піць-піць!»
Дождж умомант паспявае
Бор сасмяглы напаіць.

Поіць травы,
поіць жыта,
Гоніць шэрую тугу.
Ён — вясёлы, працавіты,
Ну а я — за ім бягу.

Дзі-лі, дзі-ва, як шчасліва
Кроплі-песенькі звіняць!
Прыйдзе час —
і ўсім на дзіва
Буду небам кіраваць.

І аблокам-абібокам
Не дазволю доўга спаць,
Шэрабокім, белабокім —
Загадаю працаваць.

То імчымся мы палянкай,
То прасторным бальшаком;
Падпяразан ён маланкай,
Я — чырвоным паяском.

*1973 г.*

## ВЕЛЬМІ «ВЕТЛІВЫ» МІКІТА...



У спякоту або ў студзень,
Незалежна ад умоў,
Людзі ўсе ідуць як людзі:
— Добры дзень!
— Салют!
— Здароў!

Усміхнецца той другому —
І абодвум весялей.
Толькі ён выходзіць з дому,
Як гусак ці Бармалей:

І надзьмуты, і сярдзіты
Вельмі «ветлівы» Мікіта!
Ён паклаў свой «Добры дзень!»
У партфель або ў кішэнь?

І каго ён пераймае?..
У дрымучых джунглях слон
Галавой слану ківае —
Аддае і слон паклон.

А як звонка ў пушчы нашай!
Берасцянка: — Цінь-цінь-цень!
— Добры дзень! — шчыгол адкажа.
Праўда, пень маўчыць як пень.

І надзьмуты, і сярдзіты
Вельмі «ветлівы» Мікіта!
Ён паклаў свой «Добры дзень!»
У партфель або ў кішэнь?

*1973 г.*

## СВІСТОК

Іграюць конікі ў траве
На скрыпачках зялёных.
Лісцё, як музыка, жыве,
Лісцё пяе на кронах.

Але не чуе наш Змітрок,
Адно ён ведае — свісток.



Гадзіну свішча, дзве
і тры, —
Шпакі,
шчыглы не рады!
І певень глухне на двары
І просіць:
— Дайце рады!

Але не чуе наш Змітрок,
Адно ён ведае — свісток.

Тры дні свістаў, тры дні шалеў,
Не тры, а быццам трыста!
Свісток асіпнуў і знямеў,
Ён сам аглух ад свісту.

І як ні дзьмухае Змітрок —
Яго не слухае свісток.

*1973 г.*

## КАЛЫХАНКА

Ад цямна і да світанку
Бор спявае калыханку
Родненькай сасонцы.
А на золку сны знікаюць,
Хмаркі белыя люляюць,
Калыхаюць сонца.

Хто схіліўся над калыскай
Над сваёй крывінкай блізкай?
Лепшыя на свеце!
І нягучны спеў матулі
Нават зорачкі пачулі,
Як малыя дзеці.

— Спі, дачушка,
Спі, дзіцятка,
Падрастай, маё зярнятка,
І не ведай ліха!
Спіце, ветры, не гудзіце,
Мілых вочак не будзіце.
Ціха-ціха-ціха!

*1974 г.*





## РОДНЫ ДОМ

Я называю родны клас
Харошаю сям'ёй.
Удзячны шчыра кожны з нас
Настаўніцы сваёй.

Яна жадае ўсім дабра
І адкрывае свет —
Ад літары вялікай «А»
Да зорак і планет...

Люблю высокі стройны дом,
Дзе нам дужэць, расці.
Ён кожным сонечным акном
Мне свеціць у жыцці.

*1974 г.*



# САЎКА ЗА СТАЛОМ

Ляжаць ля талеркі
відэлец і нож.
Дзве чыстыя лыжкі ляжаць.
— Ну і што ж?
Ляжаць, хай ляжаць, іх не буду чапаць.
Яны ж не чапаюць мяне і маўчаць.

З талеркі ён сёрбае крупнік — ой-ой!
Кавалачкі мяса хапае рукой.
Ён пальцамі ловіць у шклянцы кампот,
Абрусам ён выцер і шчочкі, і рот.

Пасля на талерку падручнік паклаў —
І кнігу карміў ён аб'едкамі страў...

Відэлец не ўцерпеў:
— За цэлы мой век
Мне трапіўся першы такі чалавек!
Ускочыла лыжка
і ну рагатаць:
— Хі-ха, ха-ха-ха,
ён дурненькі, відаць!
А нож узлаваўся і тупнуў нагой:
— Давайце паслужым мы справе другой!
Пакінем яго аднаго за сталом,
А самі запішамся ў ме-та-ла-лом!

Саскочылі разам усе са стала —
Ніякая сіла спыніць не магла.
Відэлец, і лыжкі, і нож — ля дзвярэй.
Збянтэжыўся Саўка:
— Чакайце, э-гей!
А тыя ляцяць,
азірнуцца не хочуць.
— Хі-хі, ха-ха-ха! —
толькі лыжкі рагочуць.
Бяжыць недарэка з пустымі рукамі...
Чым скончыцца ўсё?
Вы прыдумайце самі!

*1974 г.*



## ХОР



Спачатку ў залу белую
Ўступае цішыня,
І мы — адно ўжо цэлае —
І ты,
і ён,
і я.

І ночы узвіваюцца!
Над вогнішчам — прастор,
І сэрцы ўсе зліваюцца
Ў адзін сугучны хор.

Не сумнай, не мінорнаю
Я песняю жыву.
Нібы дарогай зорнаю
Плыву, плыву, плыву.

Адзін з другім суладныя
Дысканты і альты.
Мы любім песні складныя —
І ён,
і я,
і ты.

Тут пераклічка чуецца
І салаўёў, і дрэў.
І нам мацней сябруецца:
Мы — хор,
мы — дружны спеў.

*1974 г.*

## ВЫБАЧАЙ

Уявіце дзень прыгожы,
Шумны горад, светлы май.
У аўтобус спадарожны
Сеў асілак Выбачай.

Усміхаўся дзецям шчыра,
Ад натоўпу засланяў,
І старэйшым пасажырам
Ён з пашанаю казаў:

— Калі ласка,
Вы сядайце,
Я магу і пастаяць!
Выбачая-Выбачайце
Дзеці хочуць пераймаць.

— Выбачайце, — кажа Лада, —
Можна сесці ля акна?
І дзяўчына Лада рада,
У акно глядзіць яна.

— Выбачайце, — просіць хтосьці, —
Перадайце мне білет.
(Мабыць, едзе той у госці —
У руках яго букет.)

Плошчы, вуліцы, прысады...
Едзем, едзем.
Раптам — крык!
Нечакана каля Лады
Дакучай Хама ўзнік.

Загадаў дзяўчынцы злезці
І за коскі тузануў.
Стаў марожанае есці,
Выбачая штурхануў.

І круціўся, цмокаў зноўку,
Чхаў і чмыхаў Дакучай.
— Мабыць, ёсць у вас насоўка? —
Запытаўся Выбачай.

— А табе якая справа?
Хто ты ёсць? Адкуль прыйшоў?..
Выбачай, заўжды ласкавы,
Спахмурнеў ад грубых слоў.

Глянуў позіркам сур'ёзным:
Я — звычайны Выбачай.
А як возьмешся за розум —
Ты мяне тады шукай!

І саскочыў,
і закрочыў
Выбачай насустрач дню.
Дакучай расплюшчыў вочы —
Ён здзівіўся ўпершыню.

*1974 г.*



# ЧЫЖЫК

Двор.
На паркане — аб'явы сур'ёзныя,
Самыя важныя,
самыя розныя.
Ва ўсіх людзей —
неадкладныя справы.
Хто пройдзе міма такой аб'явы?

«ЗГУБІЎСЯ КОТ — КОЛЕРУ РЫЖАГА,
З ЧОРНЫМ ХВАСТОМ.
ЗАВЕЦЦА ЧЫЖЫКАМ.
ХТО ЗНОЙДЗЕ ЯГО — КАЛІ ЛАСКА, ВЯРНІЦЕ!
ВЕЛЬМІ ВАС ПРОСІЦЬ ЛЯЎКЕВІЧАЎ ВІЦЯ.
АДРАС: ЗЯЛЁНАЯ, СЕМДЗЕСЯТ ПЯЦЬ,
КВАТЭРА ШАСНАЦЦАЦЬ. БУДУ ЧАКАЦЬ!»

І людзі ў кватэру шаснаццаць прыходзілі,
Катоў беспрытульных да Віці прыводзілі:
У футры дзяўчынка,
дзядуля з кійком,
І дзядзька,
і хлопчык з малым хамяком.
А Віця сумуе:
«Не, гэта не Чыжык!
І поўстка не тая,
не Чыжык, а пыжык!»
Але ж накарміў ён катоў малаком,
Яшчэ пагуляў ён з малым хамяком.

Лашчацца рыжыкі,
труцца варкоцікі
Бокам і носам
аб ногі і боцікі.

А тата смяецца:
— Катоў мнагавата.
Быў Чыжык адзін, цяпер — поўная хата!
Але тут не трэба ні просьбаў,
ні слёз:
Не выганяць жа
іх на мароз!

*1975 г.*



# ЯК СПАЛОХАЎСЯ СІВЕР

Дзьмуў паўночны
змрочны вецер
І злаваў на ўсё на свеце.
На дарогах бушаваў,
Нават дзесьці дах сарваў.

Дзьмуў у студзені, у лютым.
Быў ён люты і надзьмуты,
Быццам мех калючак з'еў.
Выў, злаваўся
і... знямеў.

Іншы вецер — светлы, мілы —
Нёс вясну на цёплых крылах,
Ён растопліваў снягі,
Поўніў рэчак берагі.

Зменшыў ён начныя цені.
Залатое рабаценне
Ён з праменнямі прынёс
І на мой вясёлы нос!

*1975 г.*



# ЦЫМБАЛІСТЫ

Падарылі мне цымбалы —
Струн вясёлы пераразвон.
Я зайграла, заспявала:
— Дзі-лі, дзі-лі, дзі-лі-дон!

І прыйшла сяброўка Мая,
І прыбег сусед Лявон.
Кожны гукі пераймае:
— Дзі-лі, дзі-лі, дзі-лі-дон!

Весялей, сябры, іграйце,
Праганяйце з хаты сон!
І ляноту праганяйце:
— Дзі-лі, дзі-лі, дзі-лі-дон!

*1975 г.*





## ВОСЬ ЯКІ АГЕНЬЧЫК!

Я прывезла з Латвіі каменьчык —
Сонечны, бурштынавы агеньчык.
Ён уранку, быццам чарадзей,
Чараваў на беразе людзей.

Я кладу яго на ўскрайку парты —
Ажывае сінь маўклівай карты,
Як у добрай казцы, караблі
Па марáх і рэках паплылі.

Дома той бурштынавы асколак
Зіхаціць, празрысты і вясёлы.
Палюбуйся добрым светлячком —
Можа, станеш сам чараўніком!

*1975 г.*

# СКОКІ

Выраслі на агародзе
Бульба, рэдзька і часнок,
Закружылі ў карагодзе —
Злева ўправа —
скок ды скок!

І не ўцерпела капуста,
І падскочыў памідор,
Выглядала рэпа тлустай,
А лятала, як віхор.

— Не тугі і я на вуха! —
Ганарыцца бурачок.
Ён з цыбуляй-рагатухай
Спрытна скача «Крыжачок».

— От пацеха дык пацеха! —
І гарбуз, як жоўты мяч,
Аж качаецца са смеху:
— Гоп ды гоп, пайду наўскач!

Лежабокі-агурочкі,
Не жаўцейце ад нуды! —
Скача Зося,
ззяюць вочкі,
Гаспадынька — хоць куды!

*1975 г.*







## БАКСЁР

Дрыжыць зямля,
дрыжыць наш двор:
Ідзе Рыгор-баксёр.
Ён кулакамі б'е малых,
Надзьмуты — пых ды пых!

Ідзе Рыгор — сігнал бяды.
Малыя — хто куды!
Хто — у вароты, хто — за клён,
Пакуль не пройдзе ён.

Спыняюць хлопца:
— Што з табой?
Адкуль такі разбой?

Ён чырванее, як індык,
Ледзь не крычыць «кулдык!»

Адно малое — з гузаком,
Другое — з сіняком...

Ды абступіла бальшуна
Шумлівая сцяна.
Прыпёрты да сцяна баксёр
Заплакаў як бабёр:

— Не буду больш! Я не маню.
Прыміце і мяне ў гульню!

*1975 г.*

# АСІЛКІ

— Я схапіў быка за рогі
І забраў яго ў палон.

— Я валун сапхнуў з дарогі,
Важыў ён трынаццаць тон.

— Я кварталы аж чатыры
Нёс бабулю на руках.

— Пераход падняў я з віру,
Ён устаў, як сіні гмах!..

— Я такой набраўся сілы —
Гну рукамі сталь і медзь!
Я — магутны, бы асілак
Чэмпіён Алесь Мядзведзь!

Гэта ўсё пачула Галька
І сказала ціхім лялькам:

— За такімі малайцамі
Станем дужымі і самі.
Нас ніхто цяпер, сябры,
Не пакрыўдзіць на двары!

*1976 г.*



# ХЛОПЧЫК-ГРЫБ

Ён хто — апенька ці смаржок?
Ён, мабыць, мне прысніўся.
А можа, наш сусед Змітрок
У шапцы нарадзіўся?

Прыйшоў у госці ў добры дом,
Хлеб-соль яму паднеслі.
А ён у шапцы за сталом
Сядзіць, як грыб у лесе...

*1976 г.*



## ЗЯМЛЯ З БЛАКІТНЫМІ ВАЧАМІ

Зямля з блакітнымі вачамі,
Раздолле рэчак і лугоў!
Тут называюць Васількамі —
На Беларусі! — хлапчукоў.

Звіняць крыніцы, як цымбалы,
Сцяжынкі свецяцца ў лясах.
Палі, узгоркі, перавалы —
Прасторны шлях, далёкі шлях!

Краіна славы партызанскай,
Краіна міру і даброт!
Ты — наша слава, наша казка,
Як сонца, добры твой народ.

Тваe сыны, тваe унукі,
Мы любім гул тваіх бароў.
І рэкі цягнуцца, як рукі,
Да цёплых, верных рук сяброў.

*1976 г.*



## НАШ МІНСК



Ты прасторны, чысты,
Горад наш герой,
Свецiш прамянiста
Зоркай залатой.

Кожнаму кварталу
Аддаём салют!
Любiм дом Купалы —
Цiхi, родны кут.



Светлыя дарогi
Нас вядуць далей.
Плошча Перамогi
Слухае дзяцей:

Мы, як птушаняты,
Любiм неба шыр.
Дзякуем салдатам
За жыццё i мiр!

*1977 г.*

# Ідуць дадому хлопчыкі

Над светлаю прасекаю
Вячэрніх хмарак рух.
Ідуць дадому хлопчыкі,
Не сумна ім удвух.

Адзін, як шпак, насвістvae,
Адказвае другі.
І сосны, як таварышы,
Не ведаюць тугі.

Знячэўку засвяціліся
На ўзлессі светлякі.
Адзін хлапец спалохаўся
І закрычаў: «Ваўкі!»

Бяскрыўдныя агеньчыкі
Мільгаюць у траве.
Дрыжыць ён: «Вочы воўчыя!» —
І голасна раве.

Другі рагоча:
«Слухай ты,
Храбрэц, чакай, чакай!»
І рэха смехатлівае
Разносіцца:

— Ай, ай!



Храбрэц губляе тапачкі,
Ён дыхае ледзь-ледзь.
Аб корч ён спатыкаецца
І ўжо крычыць: «Мядзведзь!»

А друг падбег на выручку,
Сцягнуў яго з карча.
Такі храбрэц спужаецца
І сойкі, і драча.

І драчыкі прачнуліся:
«Ха-ха, смяльчак які!»
Бязгучна толькі ўспыхвалі
На ўзлессі светлячкі.

*1977 г.*

# ХАЙ ЧАСЦЕЙ СМЯЮЦЦА ДЗЕЦІ!

Нараджаюцца малыя
Для жыцця на белым свеце.
Як званочкі веснавыя,
Хай часцей смяюцца дзеці!

Смех наіўны, пераліўны,
Быццам рэха чалавека,
Ты звіні ў зялёным ліўні,
На цымбалах і на рэках!

Хай часцей смяюцца дзеці,
Каб ніколі родным нашым
Не прысніўся прывід смерці,
Хірасімы прывід страшны!

Хай маленькія далоні
Цягнуцца насустрач сонцу!
Бачу ў немаўляці сёння
Будучага абаронцу!

Заслані сваю надзею
Ад вайны,
ад ліхалецця!
І зямля памаладзее:
Хай часцей смяюцца дзеці!

*1979 г.*



# НАТАША БАРЫСАВА



На балконе для лялькі — прастор.
Юлька робіць для лялькі убор:
Будуць сінія стужкі, як хвалі,
З арабінавых ягад — кара́лі.

Толькі лялька глядзіць, не ўсміхаецца,
І нічога ёй
не па-да-ба-ец-ца!
— Можа, есці ты хочаш? — Маўчок.
— Можа, смачны спячы калабок?

Ані маннае кашы, ні рысавай
Не жадае Наташа Барысава.
— Ты пястуха — і болей нічога!
Тут ускочыла лялька на ногі:

— І кара́лі, і стужкі з анучамі,
І люлянкі мне ўсе надакучылі!
Хопіць гладзіць мяне па галоўцы,
Мяч хачу я ганяць на пляцоўцы.
Мне пашыйце спартыўны касцюм.
Я адкіну ляноту і сум!
Быць хачу
Не мімозай цукровай, ірысавай,
А жывою Наташай Барысавай!
Не ляжаць, не марнець на баку,
А «дзень добры!» сказаць турніку.

Раз, два,
раз, два,
Не схіляйся, галава!
Раз, два, тры, чатыры,
Смела, весела і шчыра!

Хто адважны — той здаровы.
Хто за мною?
Хто чарговы?

*1979 г.*





# ВЯСЁЛАЯ ШПАКОЎНЯ

Цяжка птушкам у завею...
Ціха скардзіцца сініца:
— Я ад холаду сівею,
Дзе мне з дзецьмі прытуліцца?

Тут адзін яе сынок
Сінячок зірнуў убок:
— Мама, мама, ёсць кватэра! —
Першы скокнуў ён праз дзверы.
У шпакоўні — пуста, ціха.
Дзесь на поўдні шпак,
шпачыха.

Тата важна сцены кратаў:
— Уцяпліць нам трэба хату.
Неслі пух, саломку неслі,
Аж забыліся на песні.
Хтось да іх у вецер, снег
Папрасіўся на начлег:
— А ці ёсць гаспадары
у двары?

Запрашала гаспадыня:
— На стале вячэра стыне.
Месца знойдзецца для ўсіх,
Для дарослых і малых!



І ўсміхнулася гасцінна
Ўсёй сямейцы вераб'інай.
Стала ў хаце весялей,
Як у добрых у людзей.

Шчабятухі-непаседы
Прывялі з сабою дзеда.
Казкі ў дзюбе ён трымаў.
Не журыўся, не драмаў.

Што пасля?
Ніякіх сварак,
Хоць на ўсіх пакой адзін.
Тут і кухня,
лазня з пáрай
І дзіцячы магазін.



Чысціць-мые дом сініца —
Ані цёмнага кута!
Вераб'іха-маладзіца
Крупнік варыць — смаката!

Верабей пад шум завей
Цешыць казкамі дзяцей.

А ў самога — гальштук чорны,
Шапку ўзяў у шэрых хмар.
І ад летніх дзён задорных
Захаваў ён свой загар.

Ён і ўзімку сонца любіць,
Промняў светлых перабор
І маленькіх соняў чубіць,
Часта кліча на прастор.

Колькі іх?
Не злічыш проста.
Ну і дружная сям’я!
На ляту хапаюць проса,
Што ў кармушку сыплю я.

Для здароўя і забавы
Неабходна лётаць ім.
Завірухі неўзабаве
Адгудуць,
сплывуць як дым.

А тады...
Бывай, шпачыны
Дом, дзе крылы адраслі.
Добры дзень, кусты шыпшыны,
Воля неба і зямлі!

Дзякуй хаце за радню,
За цяпло і дабрыню!
Прылятайце, шпак, шпачыха!
У кватэры — чыста, ціха.

*1980 г.*



## ТАБЕ ЖАДАЮ

Яшчэ вясна адпачывае,
Пад снегам дрэмле крыгаход.
Святло па хвілях прыбывае —
Прыйшоў на працу Новы год.

Адкрыў ён звонкае надвор’е,
Прасторы — лыжам і канькам,
Усё — на добрае здароўе
Дзяўчынкам нашым, хлапчукам.

Расці
і радуй, дружа мілы,
Бацькоў,
настаўнікаў,
сяброў!
Жадаю розуму і сілы
Табе для будучых гадоў!

*1981 г.*





# ЧАМУ Ў ТРЫВОЗЕ ДЗЕД МАРОЗ?

Закружыўся верталёт
Над узлескам, над палянай.
Прызямліўся Дзед-пілот,
На паляну з жахам глянуў.

— Як змяніўся гэты бор!
Быў ён весні, чысты, звонкі.
Ад сініц сінеў прастор,
І свяцiліся сасонкі.

І на Поўначы я сніў,
Як скакала тут вавёрка,
Дзяцел шышкі ёй насіў
На вячэру адвячоркам.

Я да вас вярнуўся зноў
З першым інеем, з парошай.
Толькі й следу не знайшоў
Ад мясціны той прыгожай...

Пазірае Дзед Мароз
З-пад заснежанай вушанкі:
— Не паляна — смецця воз!
Тут паперкі, там бляшанкі.

І якія дзікуны
Тут улетку бушавалі?
Лапак елкі і сасны
Для кастроў не шкадавалі...

Я ж хачу, каб на зямлі
Нават самыя малыя
Шанавалі, берaглі
Нашы радасці лясныя.

Не чапалі мурашоў,
Не чапалі гнёзд птушыных,
Каб любілі край бацькоў,
Кожны кут сваёй Айчыны!

*1982 г.*





## ПЕЎНІК

Пеця-Пеця, Петрусёк
Па сумётах — скок ды скок!
Што ты рана ўстаеш,
Сонцу спаць не даеш?

— Пазяхаць-драмаць навошта?
Маму я правёў да пошты.
З поўнай сумкай пойдзе мама —
Тэлеграмы, тэлеграмы!

Хай мяцеліца злуецца!
Мама людзям усміхнецца —
Адляцяць далёка сны
Ад вясёлай навіны.

Пеця-Пеця, Петрусёк
Па сцяжынках — скок ды скок!
Самы першы — як іначай? —
Ён прыбег у сад дзіцячы.

Будзіць мішку, зайчанятак,
Будзіць сонных парасятак.
Штурхануў ката пад бок:
— Прачынайся, абібок!

І кухарыць з цёткай Маняй,
Гаспадарыць наш сынок,
Клапатлівы пеўнік ранні —
Пеця-Пеця, Петрусёк!

*1982 г.*



## МЫ — ПЕРШАКЛАСНІКІ

Верасень, верасень,
Першы лісцік залаты,
Верасень, верасень,
Нас прывёў у школу ты.

Наша настаўніца —
Першы ў класе чалавек.
Тут пачынаецца
Казка самых сініх рэк.

Казкі нязвычныя
Мы навучымся чытаць
І таямнічыя
Лічбы, лічбы адкрываць.

Верасня яснага
Не забудзем да пары.
Мы — першакласнікі,
Мы — адданыя сябры!

*1982 г.*





## МЯЧ-ПАЦЕШНІК

Ён выбег на сцяжынку,
Падскочыў — ну і ну!
І зачапіў хмурынку,
І пагукаў вясну:

«Вясенніца, вясна,
Прыходзь, вясна-красна!»

Падумалі вавёркі,
Што сонцу ён сваяк.
І паляцеў на ўзгоркі
Вясёлы мой дзівак.

Бярозкам і сасонкам
Ён аддае паклон.
У светлым лесе звонкім
Крынічкі будзіць ён.

Не ведаючы стомы,
Знарок ляціць убок.
Не верыцца, што дома
Ён займе свой куток.

Я сам прыціхну, сонны,
Няясна будзе мне:
Ці гэта мяч зялёны,
Ці месяц у акне?

*1983 г.*

## МАЕ БРАТЫ



Я маю двух братоў-блізнят:
Дзве па́ры сініх вачанят,
Дзве залацістыя чупрыны,
Шасцігадовыя мужчыны!

Калі ў зялёных шараварах,
У куртках белых хлопцы шпарац,
Народ смяецца:
— Проста цуд!
Ну як жа іх адрозніць тут?

Ды ёсць і ў кожнае сінічкі
Свае паводзіны і звычкі,
А гэта ж людзі,
Гэта ж людзі!

Характар свой у Апанаскі:
Ён разглядае дрэвы, краскі
І кнігі розныя гартае,
«Вясёлку» па складах чытае.

У Петруся — другія справы.
Гарачы, шумны і рухавы,
Учора будаваў ён дом,
Зрабіўся сёння мараком.



Прыдумаў
з крэслаў цеплаход,
Крычыць у трубку:
— Поўны ход!
Але бяда!
Марскія хвалі —
За валам вал — забушавалі.

Маланкі, гром,
Страшэнны шторм!

Пятрусь крычыць яшчэ званчэй:
— Усе на палубу хутчэй!

Ён скінуў чаравікі,
босы
Стаіць у рубцы:
— Гэй, матросы,
Дзяцей — у шлюпкі
і старых!
А потым — ратаваць усіх!..

І раптам сціх шалёны вецер.
Прыходзіць тата:
— Добры вечар!

*1984 г.*

## ДЗЕ ТВОЙ ЧАС?

— Прачытаем разам казку! —
Ціха просіць Апанаска.
— У мяне няма цяпер
Часу вольнага, павер!
— А куды падзеўся час? —
Аж падскочыў Апанас. —
У якіх лясах гуляе,
Ён маўчыць ці размаўляе?
Дзе твой час?
Ну хоць раз
Пакажы мне час!

*1984 г.*



## ПЫТАННЕ І ЖАДАННЕ

Мільён пытанняў у запас
З сабою носіць Апанас.
Не пазнае зімой
Ён ліпы маладой,
Прыціхла ў снежнай сіняве.
— А ліпа колькі год жыве?
— І трыста год, і болей.
— А дуб у нашым полі?
— Жыць можа ён год восемсот —
Навалы не сагнулі!..
Узрадаваўся хлопчык:
— От,
Жыць столькі і дзядулю!

*1984 г.*



## НАША ЖАДАННЕ

Мы сказалі ветру,
Што нам неабходна.
Ён дагнаў над полем
Брата роднага —
Яму сказаў,
Той стрыечнага брата
дагнаў —
Яму сказаў.
Трэці вецер
Памчаўся па свеце,

Дагнаў чацвёртага,
вёрткага!
Той перадаў пятаму,
крылатаму!
Тысячы вятроў,
Дружных братоў,
Ад рання да змяркання,
Ад начы да світання
Хвілін не гублялі,
Працавалі!



Ад травінкі да травінкі,
Ад хмурынкі да хмурынкі,
Ад дзяўчынкі да дзяўчынкі,
Ад хлопчыка да хлопчыка,
Ад сэрца да сэрца
Перадаецца —
Жаданне наша гарачае,
Самае дзіцячае.

Няхай яно саграваае далоні
Белыя, чорныя, жоўтыя!
Перадайце яго па тэлефоне,
Які не мае дроту,
Толькі сёння,
толькі сёння,
Не адкладайце на потым!
Ратуйце кожную галінку,
Ратуйце ўсю зямную шыр!
Матулі, бацьку,
брату, мне,
Усім людзям родным
Неабходны МІР!

*1985 г.*





## ПЕРШАЕ СЛОВА

Першы голас, які я пачула на свеце,
Быў голасам маці.
Калыханку пад месяцам
і на дасвецці
Спявала мне маці.

Гэта — першая песня
І першае слова
Зямлі маёй весняй.
Гэта — ціхая ласка
І міру ахова.
Дзякуй, маці, за песню!

Запаветныя, родныя фарбы і гукі —
Усё застаецца.
Дзякуй, мама, за рукі,
Бяссонныя рукі,
За аддане сэрца!

Рукі цёплай пяшчоты,
Турботы і працы —
Ад ляноты лячылі.
Аніякай работы ў жыцці не цурацца
І мяне навучылі.

Не пакрыўджу цябе,
З тваіх сцежак не збочу,
Засланю ад нягоды.
Я хачу, каб свяціліся радасцю вочы
І жыла ты заўсёды!

*1985 г.*



## ЧЭРВЕНЬ

Чуеце першыя летнія гукі?
Над лугам пчаліны аркестр гудзе.
Дзеці да сонца працягваюць рукі?
Чэрвень ідзе!

Дзецям патрэбны і краскі, і горны,
Сонца для ўсіх над зямлёю — адно
І сінявокім,
і жоўтым,
і чорным
Свеціць яно.

Будзе свяціць і зямлі, і зярнятам,
Хвалям марскім і рачулкам лясным,
Горным арлам і малым буслянятам,
Толькі не жорсткім ракетам сляпым.

Людзі, вы помніце здань Хірасімы?
Сняцца жанчынам пакутныя сны
Там, дзе навек засталіся малымі
Дзеці вайны...

Верна сябруйце, людзі планеты!
Добрая воля вайну адвядзе.
Ясным прадвеснікам шчодрага лета
Чэрвень ідзе.

*1986 г.*

## БЕРАЖЫ ЗЯМЛЮ І НЕБА!

Нам цёпла ў свеце дабрыні:
Тут сонца матчынай усмешкі,
Таемнасць зорнай вышыні,
Прывабныя лясныя сцежкі.

І хто ж не любіць ясных дзён,
Калі жаўрук спявае шчыра?
Званок вясны усім чуцён.
Мы — дзеці дружбы,
мы — дзеці Міру.

Іскрыцца колерамі свет
Вясёлак, ластавак і мяты...
Ды ў кожным доме ёсць партрэт
Забітага вайной салдата.

І просяць дзеці ўсёй Зямлі —
Алесі, Патрыкі, Індзіры,
Каб людзі неба зберaглі.
Мы — дзеці дружбы,
мы — дзеці Міру!

Мы самі будзем берагчы
І кожны кут, і кожны лісцік —
Ад цемры вечнае начы,
Адкуль няма нікому выйсця.

Няхай збіраюць пчолы мёд,
Вінтоўкі будуць толькі ў ціры!
Сябры, ідзіце ў карагод,
Мы — дзеці дружбы,
мы — дзеці Міру!

*1975 г.*

# МАЙСТЭРНЯ



Я знайшоў паблізу пня
Дзіўны корань буры:
Ну якраз медзведзяня
З мордачкай панурай!

Вось прачнецца!
Раптам нос
Ад мяне адверне?
Я падняў яго, панёс
У сваю майстэрню.

І прыгледзеўся бліжэй:
Тое, ды не тое!
Ой, сучкі тырчаць з вушэй,
Лапа — з барадою!

Я ў нядзелю майстраваў
З раніцы да зорак.
Ні хвіліны не драмаў
Востры мой сцізорык.

Ты, малое, ажывай,
Тупай-тупай, назірай!

Глянь, падняўся баравік,
Побач — шышка-вожык.
Да ляноты не прывык
Мой іскрысты ножык.



Тут — вавёрка, ласяня,
Ўсе — ляснога роду.
І глядзіць медзведзяня:
«Ці няма тут мёду?»

Паскачы спярша як след,
Тоўсты, ходзіш ледзьве!

Тут прыбег Пятрок-сусед:
— Ох, які мядзведзік!
Абмяняемся. Трымай
Поўную капілку!

— Хто ж ты — зломак ці гультай?
На сцізорык, пілку!
І ў цябе, браток Пятрок,
Рукі ёсць, здаецца?

Ну а мой лясны куток —
Ён не прадаецца!

*1986 г.*

## ШТО ТЫ РОБІШ?

— У мяне свая работа,
Першы клопат — чысціня.
Не хадзіце ў брудных ботах,
Хату мыю я штодня.

Шыбы высветлю да бляску
(Я і вам дапамагу!)
І яшчэ...
Дзядулі каску,
Быццам зрэнку, берагу.

І малюю:
коннік-рыцар
З пушчы мчыцца да сяла.
Пэўна, каска-бліскавіца
Партызана берагла...

У мяне свае турботы.
Хіба рукі для ляноты?
Дома — свежы дух. Парадак.
Пабягу і да сясцёр.
Завіхаемся ля градак,
Для работы ёсць прастор.



Прэч шкадлівую травінку!
Напаіць зямельку ўсмак!
Морква ўскінула чупрынку,
І лісты нам шле бурак.
Часначок пусціў іголкі —
Ваяваць з асой гатоў.
І працуюць звонка пчолкі
Ля парэчкавых кустоў.

І малы Паўлюк заняты.
— Што раблю?
Гляджу ў акно.
Я чакаю з працы тату —
З самай раніцы. Даўно!

*1987 г.*





# ЯКІЯ ЛЕКІ Ў ДАКТАРОЎ?

Лечыць елка сасну:
Уздыхніце, а ну!
Можа, з некім пасварыліся?
Птушанят люляць стаміліся?
Жоўтыя іголкі скіньце
І ад ветру не стагніце!
Маладыя ж мы зусім —
Пяцьдзясят гадоў стаім!

А над лесам — хмары,
Хмары-санітары
Ў белых,
сіняватых,
Бэзавых халатах.
Дождж пашлюць улева,
ўправа:
— Не марнейце, дрэвы,
Зелянейце, травы!





А ў Марысі доктар свой:
Лечыць не мікстурай
(Гэтай горкаю вадой),
Не таблеткамі,
Не кроплямі
І не цёплымі пантоплямі,
Лечыць —
                    фізкультурай!
— І слата, і непагода —
Не бяда, не перашкода.
Рух вясёлы толькі лечыць,
А лянота нас калечыць! —

Гэты доктар самы-самы
Строгі, і пяшчотны,
І падчас журботны.
Гэты доктар —
                    Мама!

*1987 г.*

## ДУДКА

Мы з дзедам дудку змайстравалі,
Яна зайграла на зары,
Музычнай казкаю назвалі —
Прыходзьце, слухайце, сябры!

Шчыглы, сініцы, слаўкі, быццам
З акенца дудачкі, ляцяць.
А як паклічу я крыніцы —
Галаснікі аж зазвіняць!

І над усёй зямлёй, здаецца,
Вясёлка звонкая ўзышла.
Жывое мае дудка сэрца —
Для песень шчырых і святла.

*1988 г.*







## ГАРМОНІК

Ён вучыўся ў лесу, нівы,
У крынічак і ў людзей.
Любіць розныя матывы
Мой гармонік-чарадзей.

Травам ціха адгукнецца,
Заіграе ў такт вятрам,
І смуткуе,
і смяецца,
Блізкі сэрцу і рукам.

Мех расцягваю,
сціскаю —
Загудзеў зялёны бор!
Вам іграць дапамагаю,
Сосны, елкі і чабор.

Як зайграю польку-янку —
Скокі, смех, вясёлы крык.
— А цяпер сыграй «Зямлянку», —
Просіць дзед мой франтавік.

Гляне ён, памаладзелы:
— Старадаўні вальс давай! —
І плыве ў бярозках белых
Залацісты, мілы край.

*1988 г.*



## ВЯТРАМІ ПАДШЫТЫ

Дажджамі пакрыты,
Вятрамі падшыты
У грака пінжак.
Крычыць на грачыху,
Грачыху-краўчыху
Прастуджаны грак.

*1988 г.*



## ЧАПЯЛА І ЧАПЛЯ

Чапяла з хаты ўцякла, раскрычалася,
Чапяла да чаплі чаплялася:
— Чаму, чапля, ногі доўгія ты маеш?
Чаму, чапля, па балоце ты блукаеш?
Але чапля смяяцца пачала:
— Чапу-ляпу, чапу-ляпу,
Пешаходаў не чапай, чапяла!

*1988 г.*



## ХВАЛІЛАСЯ КАША

Аржаная каша сама сябе хваліць,
Прасяная каша сама сябе хваліць.
Якая ж каша слушна кажа?
Хто адкажа?
— Я! — сказаў Яша. —
Прагнала мой кашаль
Аўсяная каша!

*1988 г.*



## ЦЫМБАЛЫ

У цымбаліста — дзіва-рукі.
Нам падарыў на радасць ён
Дажджынак светлых перагукі,
Зязюлі кліч,
Пчаліны звон...

І струны ўдалеч павялі,
Як сцежкі роднае зямлі.

*1989 г.*

# ДЗЕЦІ АРМЕНІІ

Чайкам махаюць рукамі смуглявымі,
Першыя ўсмешкі, нібыта праменні.
Клічуць сталы з нарачанскімі стравамі:
— Вам на здароўечка, дзеці Арменіі!

Вочы журботныя, колькі вы ўбачылі
Горкіх руінаў і целаў халодных!..
Каб загаіліся раны гарачыя,
Ласку мы знойдзем для родненькіх-
родных.

Тут падрастайце, гуляйце, вучыцеся —
Кнігі і сшыткі нікім не адменены.
Ды з беларускіх сасонак дзівіцеся,
Мілыя парасткі, дзеці Арменіі!

Сосны раскажуць, як месяц за месяцам
Іншым дарылі і радасць, і сілу,
Як «Зубраня» сваім сонцам і месяцам
Ціхіх чарнобыльскіх дзетак лячыла...

Добрымі сэрцамі свету адроджаны,
Ўзнімецца край ваш ад самых карэнняў.
Вас абдымаю, як двойчы народжаных,
Дзеці Арменіі, дзеці Арменіі!

*1989 г.*



## СКРЫПКА

Конік у лузе на скрыпцы зайграў —
Светнік, рамонкі, вярбу чараваў.

Скрыпка пявучая ёсць і ў мяне,
Ёсць таямніцы — у кожнай струне:
Смыкам гукаю мелодыі лета,
З конікам разам іграем дуэтам.

*1989 г.*

## БЯРОЗАВЫ ЛІСТОК

А я пакуль не гарманіст.
Прыклаў да вуснаў звонкі ліст,
Штосілы дзьмухаю-іграю —
Высокі гук ляціць над гаем.
Цішэй падзьмухаю знарок —
Адкажа басам мой лісток.

*1989 г.*



## БУБЕН

Эх, грымяць званочкі-бомы,
Перасмешкі, пераклік.
Бубен, бубен, ты вядомы
Весялун і жартаўнік!

*1989 г.*

# РЭЧКА-РЭЧАНЬКА МАЯ

Я не хачу, каб рэчка высыхала,
Дзе чую ўсплёскі рыбак залатых,
Дзе човен скача ля свайго прычала,
Калі бягу па травах лугавых;

Дзе лёд зімой іскрыцца ў сто вясёлак
І дзе вясной бушуе крыгаход.
Плыві, рака, паміж бароў вясёлых,
Каб зелянелі сосны круглы год!

Каб жаўранак гукаў вясну і лета
І не кранула птушачку бяда!
Каб не знікала з нашай студні светлай
Сцюдзёная і смачная вада!

Я не хачу, каб цінай безгалосай
Заплеснеў бераг, на якім стаю.
Прашу людзей, прашу я ўсіх дарослых:
— Абараніце рэчаньку маю!

Я падрасту і вам дапамагу —
І рыбку залатую зберагу.

*1990 г.*



## МОЙ РЫЖЫ БІМ

Спалоханы нечым, прамчаўся ён міма.
Знікаў і вяртаўся. Шукаў ён каго?
І ўспомніў я кнігу пра белага Біма,
Пра Біма і чорнае вуха яго.

І ў гэтага Біма сірочыя вочы —
Сумуе, напэўна, па доме былым.
І есці чужых пачастункаў не хоча
Галодны і рыжы, нястрыжаны Бім.

Кавалачак сала падкінуў прахожы,
Сабака не глянуў, пабег, пакульгаў.
Пячэння не ўзяў у дзяўчынкі прыгожай.
Я свіснуў працягла — і раптам ён стаў.

Каго нагадаў яму ўсмешкай і свістам?
Руку ён лізнуў і кіўнуў галавой.
Сказаў я: — Ты будзеш здаровым і чыстым,
Самотным, гаротным не будзеш са мной!

Сабаку адмыў і пастрыг акуратна,
Карміў як належыць: — Ачуньвай, дружок!
Са мною па вуліцах бегаў ён, рады,
Два дні весяліўся, на трэці... уцёк.

Свістаў я і клікаў, шукаючы дбала.
Навошта пабег? Да якога двара?
А можа, сабаку майму неставала
Былога і лепшага гаспадара?

Хадзіў я далёка — налева, направа,
І мне памагала каманда хлапцоў:
Расклейвалі з просьбай трывожнай аб’явы...
Два тыдні шукаў, ды яго не знайшоў.

Аднойчы, пад вечар дажджлівы і шэры,
Вушам і вачам не паверыў сваім —
Кароткімі лапамі стукаў у дзверы
Мой рыжы, галодны, нястрыжаны Бім.

*1991 г.*



# КЛЁН



Сем дзён губляе лісце клён
І тчэ дыван вясёлы.
І вось напрацаваўся ён,
Застаўся з голлем голым.

Затое людзям прыбярог
Багацце залатое.
А для маленькіх спрытных ног
Раздолле тут якое!

Бяжы, куляйся, слухай звон,
Затоены ў лістоце.
Глядзіць і радуецца клён —
Жыве не ў адзіноце.

Упаў з разбегу Васілёк
На ложак мяккі, новы,
Ён цёплы падхапіў лісток.
Як ветразь, ліст кляновы.

І Васілёк плыве, плыве
На караблі асеннім.
Якою казкай ён жыве,
Нястомны ў летуценні?

А клён? Ён марыць аб адным,
Ён зноў вясну чакае —
Зялёным стане, маладым
І птушак пагукае.

*1991 г.*



# ЛЯШЧЫНА

Пад колер яркае каліны,
Над ручаінаю лясной,
Заззялі зорачкі ляшчыны —
Вясной павеяла, вясной!

І над пупышкай неўзабаве
Цікаўны выблісне лісток.
Не толькі для тваёй забавы
Расце арэхавы лясок.

Там, пад ляшчынаю, на ўзгорку,
Ты не пужай ваверчанят!
Убачыш мамачку вавёрку
І дзесяць зыркіх вачанят.

З пянька на пень гарэзы скачуць,
Мільгаюць пышныя хвасты.
Калі ж малыя ў крыўдзе плачуць,
Скажы, ці гэта чуеш ты?

Ты сэрцам слухай дрэвы, травы —
Там зверанят і плач, і смех.
І, можа, ты пачуеш нават,
Як спее і расце арэх.



Калі змякчэе неба просінь
І паярчэе лесу ўбор, —
Ляшчына з ласкаю запросіць
На звонкі і вясёлы збор.

І будзе ўсю зіму сагрэты
Ваверчын дом, паўнюткі дом.
І ты збярэш дарункі лета
З яго цяплом, з яго дабром!

*1993 г.*





## ЯЛІНА

Яна панураю здаецца:
Іголак колкіх не крані!
Але яліна мае сэрца,
Дзе ёсць агеньчык дабрыні.

На верхавіне чыжаняты
Глядзяць на неба з цёплай хаты
І сталі аж на край гнязда —
Паслухаць пеўчага дразда.

І ўжо спрабуюць голас самі,
Бацькі ім падарылі слых.
Шкада, не стануць салаўямі!
Яліна ж цешыцца з малых.

І на руках ёй гушкаць люба
Рухавых дзетак крыжадзюба.
Як промнік, асвятляе змрок
Жоўтагаловы каралёк.

А вось на спеўку прыляцелі:
Рабіннік з ліставых лясоў,
Заранка рассыпае трэлі,
Шчыруе чарада шчыглоў.

Такога не пачую ўвосень!
Мне выдаў месяц май білет —
На золку чую шматгалоссе,
Канцэрт на ўвесь зялёны свет.

*1993 г.*

# ЯСЕНЬ І ЯСЬ

У цёмным лесе ёсць прасвет —
Жыве яснюткі Ясень,
Глядзіць ён з ласкаю на свет
І размаўляе з Ясем.

— Ты мой сваяк сярод людзей,
Вазьмі мяне за голле
І павядзі хутчэй, смялей
Па ўзгорках на прыволле!

Хачу знайсці сваіх братоў,
Маленькіх і дарослых, —
Паміж ялін, паміж дубоў,
Алешын, дзічак, соснаў.

Як ім спяваецца вясной?
Як ім зімой жывецца?
Мой хлопчык Ясь, хадзем са мной,
Мо хтосьці адгукнецца!

Падумаў Ясь: «Ну як тут быць?
Я стану паштальёнам!»
Праз лес асенні ён бяжыць
Па купінах, адхонах.

Прынёс ён Ясеню лісты
І зблізку, і здалёку:
— Дык болей не журыся ты,
Бо ты ж не адзінокі!



Багата я сяброў спаткаў
У гэтым вандраванні.
Ты бачыш? Кожны напісаў
На лісціку вітанне!..

Ад мілых родзічаў паклон
Прымае ціхі Ясень.
Яснее, весялее ён,
Да сэрца туліць Яся.

*1993 г.*



# ПРАЛЕСКА

Калі пралеска нараджаецца
Ў сваёй святліцы пад сасной, —
Вачыма яснымі ўсміхаецца
І быццам гутарыць са мной.

Яна пад коўдраю зімоваю
Даўно прачнулася, расла,
Як неба, фарбы васільковыя
На ўцеху нам усім знайшла.

І кожны год пароваю весняю
Дзіўлюся з мілае красы.
Пралеска! Матчынаю песняю
Чаруюць родныя лясы...

Іду я ўвосень пералескамі,
Часіну згадваю адну,
Калі мая зямля пралескамі
Гукала шчодрую вясну.

*1993 г.*



## ВЯСЁЛКА

Вяснянка наша мілая,
Ну, хто ж табе не рад?
Жывуць тут людзі добрыя,
Тут ёсць дзіцячы сад.

«Вясёлкай» называемся
За нашу весялосць.
Вясёлкавыя колеры
Ў алоўках нашых ёсць.

Тут слова беларускае,
Як музыка, гучыць.
З разумнай казкай вучымся
На свеце лепей жыць.

Каб нашы мамы добрыя
Не ведалі тугі,
Ні холаду, ні голаду,
Ні доўгае чаргі.

Вяснянка наша мілая!
Малюем сонца ўсход,
Малюем хмаркі дзіўныя
І кветак карагод.





Усё жывое, роднае
Мы будзем шанаваць.
Вавёрку, птушку, вожыка
Любіць і гадаваць.

Вяснянка наша мілая,
Ну, хто ж табе не рад?
Жывуць тут людзі добрыя,
Тут ёсць дзіцячы сад.

*1994 г.*



## СТОЛЬ І ПАДЛОГА

Дзеці ноччу казку снілі.
Шарык спаў, не сніў нічога.
І якраз у тыя хвілі
Столь спрачалася з падлогай:
— Чуеш ты?
Я ў хаце — неба,
З вышыні гляджу я смела!..
Тут падлога зашумела:
— Ну а я — зямля,
Я — глеба!
Туп-туп-туп! —
Малыя крокі
Я гукаю, я прымаю.
— Гэта што?
А я ад спёкі
І ад сцюжы засланяю.
Ад мяне хмурынкі блізка,
Блізка ластаўкі-вяснянкі.
— Да мяне ж бліжэй калыска
І матуліны люлянкі...
Тут Алесь расплюшчыў вочы,
І не спіцца болей Олі:
Зайчык сонечны падскочыў
Ад падлогі аж да столі.

Дзеці ноччу казку снілі...

*1995 г.*

# КАШТАНЫ

У зялёных скрыначках жылі
Рудавата-цёмныя каштаны.
Вось яны пад восень падраслі,
Кожны — быццам яблычак крамяны.

Падалі да долу — бом-бом-бом!
Хопіць у шкарлупінках хавацца!
Бліскуноў сабрала я пятнаццаць,
Пад дажджом прынесла іх у дом.

І цяпер, у гулкі час завей,
З імі ў гульні розныя гуляю:
Гэты — шайба, хатні мой хакей,
А таго я на руках люляю.

Часам разбягаюцца яны,
Бо не вельмі кожны паслухмяны.
Носяцца па доме скакуны —
Звонкія, вясёлыя каштаны.



А каштан-асілак за акном
Зноў вясны чакае, нібы свята.
Ён узніме кветкі над дваром —
Белыя, ў карунках ружаватых.

*1995 г.*

## ЗЯЛЁНЫ ДУБ

Яго не трэба падганяць,
Ён ведае сваю работу:
Цябе ад ліўняў засланяць
І цень даваць табе ў спякоту,

Ахоўваць птушанятак сон
І не схіляцца ў навальніцу.
За доўгі век удзячны ён
Вясёлкам, сонцу і крыніцам.

Яму стае святла, вады
На ўлонні роднае паляны.
Гайдаць ён любіць жалуды —
Сыночкаў будучых жаданых.

Сынам ён хоча падарыць
Зямлю і Шлях над ёю Млечны.
Ім пад лістотай добра жыць,
Ім баіць казкі дуб адвечны.

Парой асенняй жалуды
Паціху ападаюць долу,
Каб тут праз нейкія гады
Падлесак зашумеў вясёлы.

*1996 г.*

## ДУХМЯНЫ ЧАЙ

Калі ты застудзіўся ў непагоду —
Таблетак розных не глытай!
Найлепей — лыжка ліпавага мёду
І ліпавы духмяны чай.

І здасца: ліпа адчыніла дзверы,
Жаданай госцяй увайшла.
Павесялела раптам у кватэры
Ад цвету, быццам ад святла.

Зялёна-жоўтых кветак водар
Спакою пчолам не дае.
Пчала не спіць, пчала не лодар —
І так гудзе, нібы пяе.

Ты ачуняў, нібы не кашляў зроду.
Мы заўтра скажам: — Уставай!
Вось што такое лыжка мёду
І ліпавы духмяны чай!

*1996 г.*



# ЗОСІНЫ САКРЭТЫ

Чаму ты, Зося, прысядаеш,
Гуляеш так ці наглядаеш?

— Мая загадка —
Мая адгадка!

Прысяду я — маленькай буду:
Убачу я такія цуды,
Што бачыў мой браток Змітрок,
Калі зрабіў свой першы крок!



— Нямала цудаў навакол.
Ну а цяпер скажы мне, Зося,
Чаго ўзнялася ты на стол,
Што там цікавага знайшлося?

— Мая загадка —
Мая адгадка!

А вельмі зведаць я хачу,
Што бачна дзеду Кузьмічу:
Калі вакол я зверху гляну —
На міг сама дарослай стану!

*1996 г.*



## ПАЖАДАННЕ

Ты скажы, каму нямілы
Дзень зімовы, белакрылы?
Налятае снегавей —
Клічуць лыжы і хакей.

Будзь разумны, спрытны, дужы,
Не пужайся лютай сцюжы!
І ўсміхнецца Дзед Мароз:
— Чэмпіён у нас падрос!

Новы век не за гарамі,
Будзьце ўсе працаўнікамі!
Хай шчаслівых дзён прыход
Набліжае Новы год!

*1998 г.*

# ЛЮБКА-ЛЮБА

Любіць Любку-Любачку
Цэлы белы свет.
Можа, хто адкажа мне —
Ў чым жа тут сакрэт?

Жэўжыкі памчаліся
Па яе слядах,
Прывучае кожнага
Бегаць на каньках,

Сцюжы не палохацца,
Смела ўстаць на лёд...
А самой настаўніцы
Толькі сёмы год.

Вось бабуля з кошыкам
Ледзьве-ледзь брыдзе.
Побач Люба вырасла —
І не быць бядзе.

Кацянё падбітае
Цягне Любка ў дом,
Лапку перавязвае,
Поіць малаком.

Ёсць у Любкі прымаўка:
— Што я вам раблю?
Анічога дзіўнага —
Проста ўсіх люблю.

*1998 г.*





## ВОСЬ ЯКІЯ ФУТБАЛІСТЫ!

Ёсць у нашай коткі Данкі
Тры дачушкі, тры бялянкі,
У футбол гуляюць,
Маму забаўляюць.
Скача з ніткамі клубок,
Рыжы мячык-калабок.
Футбалісты для размінкі
Часам падмятуць смяцінкі,
Лапкі ўмыюць языком.
Любіць іх сабака Гром.
Ён куляецца з малымі,
Хоць асілак перад імі.
Скокне ўгору
І на дол,
І пішчаць бялянкі — гол!
Ён на задніх лапах ходзіць.
І з малечай карагодзіць.
Ціхім вечарам на сон
Прынясе падсцілку ён,
Ім спявае калыханку.
Гром шануе котку Данку.

*1998 г.*



## ЯК ЦІШКА ТРАПІЎ У КНІЖКУ

Цішка гульні выдумляе:
Глянь, паслухай...
Ён мяняе
Снежную бабу —
на зялёную жабу,
Чорнага індыка —
на рыжага хамяка,
Шумную пласцінку —
на сасновую галінку,
Каштоўную марку —
на белую хмарку,
А ключоў жалезных вязку —
на дзедаву казку.

*1998 г.*



## КОНЬ І КОНІК

Рыжы конь хадзіў па лузе.
Там, на волі, паміж траў,
Хтось зялёны, невялічкі
І скакаў, і стракатаў.

Конь здзівіўся, глянуў скоса:
— Гэй, малеча, хто ты ёсць?
— Хто я? Конік.
Тут жыву я,
І на лузе я — не госць!

— Конік? Дык няўжо калісьці
Быў я сам такім малым?..
І схіліўся конь з пяшчотай:
— Будзеш родзічам маім!

Ну а тут здзівіўся конік,
Жвавы, спрытны, як агонь.
Да асілка ён падскочыў:
— Адкажыце, хто вы?
— Конь!

Засмяяўся конік звонка:
— Вось адкуль мой добры род!
Значыць, я вялізным буду,
Падрасту за нейкі год.

Ён за хвост каня ўчапіўся,
Балабоніў на ўвесь луг —
Камарам, жукам хваліўся:
Конь — яго і брат, і друг.

На сцяблінцы, як на скрыпцы,
Ён іграў, вадзіў смыком.
Верыў ён, маленькі конік, —
Дужым вырасце канём!

*1999 г.*



## СОМ І СОН

Сом сасніў салодкі сон:
Ён зусім не сом нібыта —
Кіт заморскі самавіты.
Сом праз сон пужае качак:
— Эх вы, качкі-небарачкі!
— Ну а ты не кіт, а зломак! —
Качкі ўселіся на сома.
Качаняты не зявалі,
З вусам сомавым гулялі.

*2000 г.*



## ЗМЕСТ

Сябар дзяцей .................................... 4
А вы пазналі? .................................... 8
Шчодры Цішка .................................... 10
Кот і сонца .................................... 11
Мой каляндар .................................... 12
Ціхі вечар .................................... 14
Музыканты .................................... 16
Як нас здымаў фатограф .................................... 17
Я – рабочы .................................... 18
Мама песціла малога .................................... 19
Галоўны дворнік .................................... 20
Ліст .................................... 22
Як нашкодзіла Мальвіна
цацкам, дзецям і машынам .................................... 24
Дажджы .................................... 27
Дзецям .................................... 28
Скрыпач .................................... 28
Навасёлы .................................... 30
Споць Алёнка .................................... 31
Перад дарогай .................................... 32
Лісток .................................... 33
На варце ганаровай .................................... 34
Край сяброў маіх .................................... 36
Узбекскі госць .................................... 37
Хто перагоніць? .................................... 39
Вельмі «ветлівы» Мікіта .................................... 40
Свісток .................................... 41
Калыханка .................................... 42
Родны дом .................................... 43
Саўка за сталом .................................... 44

Хор .......................................................46
Выбачай .................................................47
Чыжык......................................................49
Як спалохаўся сівер....................................51
Цымбалісты ..............................................52
Вось які агеньчык! .....................................53
Скокі.........................................................54
Баксёр.......................................................55
Асілкі.........................................................56
Хлопчык-грыб ............................................57
Зямля з блакітнымі вачамі.........................58
Наш Мінск .................................................59
Ідуць дадому хлопчыкі ...............................60
Хай часцей смяюцца дзеці ..........................62
Наташа Барысава .......................................63
Вясёлая шпакоўня.......................................65
Табе жадаю................................................68
Чаму ў трывозе Дзед Мароз? .......................69
Пеўнік........................................................71
Мы – першакласнікі ...................................72
Мяч-пацешнік ............................................73
Мае браты..................................................74
Дзе твой час? .............................................76
Пытанне і жаданне.....................................76
Наша жаданне ...........................................77
Першае слова .............................................79
Чэрвень .....................................................80
Беражы зямлю і неба..................................81
Майстэрня .................................................82
Што ты робіш?............................................84

Якія лекі ў дактароў? 86
Дудка 88
Гармонік 89
Вятрамі падшыты 90
Чапяла і чапля 90
Хвалілася каша 91
Цымбалы 91
Дзеці Арменіі 92
Скрыпка 93
Бярозавы лісток 93
Бубен 93
Рэчка-рэчанька мая 94
Мой рыжы Бім 95
Клён 97
Ляшчына 98
Яліна 100
Ясень і Ясь 101
Пралеска 103
Вясёлка 104
Столь і падлога 106
Каштаны 107
Зялёны дуб 108
Духмяны чай 109
Зосіны сакрэты 110
Пажаданне 111
Любка-Люба 112
Вось якія футбалісты 113
Як Цішка трапіў у кніжку 114
Конь і конік 114
Сом і сон 116

Літаратурна-мастацкае выданне

Серыя «Бібліятэка часопіса "Вясёлка"»

**Агняцвет** Эдзі Сямёнаўна

# У свеце дабрыні

Зборнік вершаў

Укладальнікі:
**Бычко** Алена
**Богуш** Святлана

Рэдактар *А. М. Зэкаў*
Мастак вокладкі *В. К. Жалудкова*
Дызайн *В. К. Жалудкова*
Мастацкі рэдактар *І. А. Маслакова*
Камп'ютарны набор *К. М. Дзегель, І. А. Маслакова*
Камп'ютарная вёрстка *І. А. Маслакова*
Карэктар *С. Я. Богуш*

Падпісана да друку 30.09.2013. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,75. Ул.-выд. арк. 8,3. Тыраж 2000 экз. Заказ 1561.

РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
ЛИ № 02330/639 ад 31.01.2012.
Вул. Будзёнага, 21, 220070, г. Мінск.

Надрукавана ў друкарні
ААТ «Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа».
ЛП № 02330/0150496 ад 11.03.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220600, г. Мінск.

Жывая класіка

Бібліятэка часопіса «Вясёлка»

Дзяцінства — цудоўная краіна, у якой заўсёды знойдзецца мноства цікавых спраў і гульняў. Падчас гульні можна шмат чаму навучыцца, але яшчэ больш можна даведацца з цудоўных кніжак, напісаных на мілагучнай роднай мове. Такія кніжкі абавязкова павінны быць у кожнай сям'і!

Разумеючы гэта, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі і дырэктар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Мікалай Супрановіч вырашылі аб'яднаць свае намаганні і выдаць унікальную серыю кніг для дзяцей, якая атрымала назву «Бібліятэка часопіса "Вясёлка"».

У гэтай серыі маленькія чытачы і іх бацькі знойдуць вершы, апавяданні, беларускія народныя і аўтарскія казкі, а таксама казкі народаў свету, нарысы, загадкі, скорагаворкі і шмат іншага.

Аўтары кожнага твора — класікі беларускай дзіцячай літаратуры і таленавітыя сучасныя пісьменнікі. Творы, якія ўключаны ў кнігі серыі, прайшлі сапраўднае выпрабаванне часам: усе яны былі надрукаваны ў часопісе «Вясёлка» ў розныя гады, але сустрэліся толькі на старонках кніг серыі.

Ад усяго сэрца жадаем вам і вашым дзецям прыемна і карысна правесці час за чытаннем нашых кніг!

ISBN 978-985-471-656-5

9 789854 716565

Вясёлка

АіВ
Адукацыя і выхаванне
выдавецтва

Бібліятэка часопіса «Вясёлка»

Эдзі Агняцвет

# У свеце дабрыні